**ПАКРО́ВЫ**, П а к р о ў, П а к р а в ы, старажытнае свята. Адзначаецца 14 кастрычніка н.ст. толькі праваслаўнымі. У аснове свята — з'яўленне ў 910 годзе ў Канстанцінопалі Блажэннаму Андрэю і яго вучню Епіфану Багародзіцы, якая трымала над малельнікамі ў храме белае пакрывала і прамаўляла малітву пра выратаванне свету. У нар. уяўленні паняцце «пакровы» атрымлівала куды больш шырокі сэнс, ахопліваючы самыя розныя прыкметы прыроды гэтага часу: «Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам», «...рыбу лускoй, дрэва карой, птаху пяром, дзеўку чапцом». Гаварылі, што на П. зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю пасля гэтага дня і да вясны ніхто не можа знайсці скарбаў. З гэтага свята пачыналася зімаванне скаціны ў хляве: «Пакрова — зарыкала ў хляве карова». Пра нерухавага гаспадара гаварылі: «Хто сее па Пакрове — не будзе мець чаго даць карове». П. паказваў прагноз надвор'я на будучае: «Калі да Пакрова дня снег не пакрыў зямлю, на Каляды не будзе снегу»; «Якое надвор'е ў дзень Пакрова, такое яно і будзе ўсю зіму да вясны»; «Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ дзве нядзелі»; «Калі ад Пакроў да свята Усіх святых (1 лістапада) краты зямлю точаць, то зіма будзе снежна і марозліва». Асабліва пільна сачылі на П. за напрамкам ветру: з якога боку ён быў у гэты дзень, з таго боку ён будзе дзьмуць галоўным чынам і ў бліжэйшую зіму. Паўночны пакроўскі вецер прадказвае суровую зіму, а паўднёвы — мяккую, гнілую. Калі ж з раніцы задзьме ўсходні вецер, зіма будзе маласнежная, заходні — наадварот, вельмі снежная. Пчаляры прыкмячалі: калі дажджлівы дзень на Пакровы — на наступны год пчолы збяруць багата мёду. У гэту вясельную пару хлопцы выглядалі сабе нявест, а тыя напярэдадні П. варажылі на замужжа: набіралі ў хвартух апалае лісце і вытрасалі з прыполу — куды вецер панясе, туды і замуж ісці.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 536—540; Земляробчы каляндар. Мн., 1990. С. 273.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ